**Ananko Kirill**
Yanka Kupala State University of Grodno;
Gymnasium No. 7 named after V.T. Kolokolnikov, Grodno
e-mail: kirixan@yandex.ru

TO THE HISTORY OF EXISTENCE OF GRODNO
BELARUSIAN GYMNASIUM IN 1920–1921

The article reveals the activity of the Grodno Belarusian Gymnasium, which existed in 1920–1921. Based on the sources found, some facts from the history of the institution are introduced for the first time, the composition of the staff is given, and the working conditions of the gymnasium are analysed. The conclusion is made about the incomplete activity, difficult conditions and reasons for the closure of the educational institution.

*Keywords:* Belarusian gymnasium, Belarusian orphanage, Grodno, interwar period.

УДК 377.8(476)«18/19»

**В. М. Астрога**

## ПАДЫХОДЫ ДА РАШЭННЯ ПРАБЛЕМЫ КАДРАВАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ СЯРЭДНІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX ст.)

Разглядаюцца асноўныя падыходы да вырашэння праблемы забеспячэння кадрамі настаўнікаў сярэдняй школы Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Падкрэсліваецца, што ў дадзены перыяд дакладнай сістэмы педагагічнай падрыхтоўкі створана не было, яна ў асноўным ажыццяўлялася рознымі тыпамі вышэйшых навучальных устаноў Расіі. Высновы грунтуюцца на аналізе гістарычных крыніц, аналізе статыстычных матэрыялаў і дарэвалюцыйнай літаратуры.

*Ключавыя словы:* сярэднія навучальныя ўстановы, Віленская навучальная акруга, гісторыка-філалагічныя інстытуты, універсітэты, педагагічныя курсы, настаўнікі.

Найважнейшым фактарам фарміравання педагагічнай інтэлігенцыі ў разглядаемы перыяд з’яўлялася дзяржаўная палітыка ў сферы асветы, якая характарызавалася ва ўмовах складанай грамадска-палітычнай сітуацыі непаслядоўнасцю і рэакцыйнасцю. Праблема стварэння сістэмы педагагічнай адукацыі на працягу ўсяго XIX стагоддзя заставалася вострай: пасля закрыцця ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта і ў 1864 г. Горы-Горацкага сельскагаспадарчага інстытута на тэрыторыі Беларусі не засталося ніводнай вышэйшай навучальнай установы. Вакантныя месцы ў сярэдніх навучальных установах пачалі запаўняць «прыродныя рускія» педагогі з вышэйшай адукацыяй, спецыяльна дасланыя ў Віленскую навучальную акругу з цэнтральных расійскіх губерняў. У некаторых выпадках да выкладання дапускаліся мясцовыя педагогі праваслаўнага веравызнання, якія мелі дыпломы аб заканчэнні сярэдніх навучальных устаноў.

Працэс падрыхтоўкі неабходных выкладчыцкіх кадраў для сярэдняй школы, несумненна, павінен быў здзяйсняцца ў рамках інстытута вышэйшай адукацыі. Абавязковым паказчыкам прафесіяналізму будучага настаўніка нараўне з агульнатэарэтычнымі ведамі станавілася і спецыяльная педагагічная адукацыя.

Новым падыходам да вырашэння кадравай праблемы было выдзяленне 20 штогадовых стыпендый для ўраджэнцаў заходніх губерняў, якія размяркоўваліся паміж Санк-Пецярбургскім, Маскоўскім, Харкаўскім і Казанскім універсітэтамі і давалі магчымасць іх суіскальнікам атрымаць вышэйшую адукацыю. Пасля закрыцця Галоўнага педагагічнага інстытута ў Пецярбургу (пераўтвораны ва ўніверсітэт), які на працягу 1828–1859 гг. «даў у навучальную службу» 682 чалавекі (у вышэйшыя навучальныя ўстановы – 43, у сярэднія – 377, у ніжэйшыя – 262 чалавекі), падрыхтоўка новых настаўнікаў ішла ў занадта абмежаваным маштабе [1, с. 147].

Пераўтварэнне гімназій па статуце 1864 г. звярнула асаблівую ўвагу Міністэрства народнай асветы на вырашэнне кадравай праблемы. Недахоп настаўнікаў у навучальных установах заходніх губерняў прывёў да неабходнасці заснаваць у гэтых мэтах асобыя стыпендыі. На расійскія вышэйшыя навучальныя ўстановы быў ускладзены абавязак падрыхтоўкі настаўнікаў для гімназій і прагімназій усёй імперыі, у тым ліку і Беларусі. На падставе меркавання Дзяржаўнага Савета, зацверджанага 13 траўня 1863 г., «вызначана змяшчаць да 60 стыпендыятаў ва ўніверсітэтах Маскоўскім, Харкаўскім і Казанскім, па 20 у кожным, з вызначэннем памеру кожнай стыпендыі ў 250 руб. і з абавязацельствам для стыпендыятаў служыць па вучэбнай частцы ў заходніх губернях» [2, с. 10]. Акрамя таго, у 1864 г. на аснове Найвышэйшага наказу 25 мая 1864 г. для падрыхтоўкі настаўнікаў у сярэднія навучальныя ўстановы Віленскай навучальнай акругі пры Дэрпскім універсітэце было заснавана 30 стыпендый, па 300 руб. кожная. Таксама спецыяльна для папаўнення настаўніцкага корпуса гімназій Віцебскай і Магілёўскай губерняў з 1838 г. штогод выдзяляліся дзве стыпендыі, па 142 руб. 85 к. кожная [2, с. 11]. Варта адзначыць, што для суіскальнікаў стыпендый агаворваліся дастаткова жорсткія патрабаванні: па-першае, устанаўліваліся цэнзы (нацыянальны і канфесійны – прэтэндэнты павінны быць, як правіла, рускімі праваслаўнага веравызнання, а таксама адукацыйны – гэта ці студэнты універсітэтаў, ці лепшыя выпускнікі гімназій, у атэстатах якіх былі выдатныя адзнакі па прадметах універсітэцкага курса), і па-другое, пасля заканчэння навучання яны павінны былі адпрацаваць у сярэдніх навучальных установах Віленскай акругі не менш за 6 гадоў.

Пры Пецярбургскім, Маскоўскім, Казанскім, Кіеўскім і Харкаўскім універсітэтах былі арганізаваны спецыяльныя педагагічныя курсы кандыдатаў-стыпендыятаў на пасады настаўнікаў. Тэарэтычныя заняткі дапаўняліся педагагічнай практыкай – слухачы наведвалі ўрокі ў гімназіях з мэтай азнаямлення з метадамі і прыёмамі лепшых выкладчыкаў, пасля чаго самастойна вялі выбраныя імі прадметы пад наглядам кіраўніка [3, с. 203]. Пасля здачы экзамена па тэорыі і праходжанні педагагічнай практыкі выдаваліся дыпломы. За час свайго існавання курсы выпускалі па 50–70 настаўнікаў за год. Разам з тым, у самой арганізацыі навучання былі выяўлены сур'ёзныя недахопы: памеры стыпендый былі вельмі бедныя (у 1864 г. усіх стыпендый было 259 на суму 66 185 руб. 70 кап., з іх 153 прызначаліся для ўнутраных губерней і 106 – для заходняга краю), праграмы шматпрадметныя і складаныя, недастатковы кантроль над заняткамі кандыдатаў [4, с. 424].

Паралельна распрацоўваліся і новыя праекты вырашэння гэтай вострай праблемы. Зыходным пунктам з'явілася прапанова нямецкага філолага Ф. Рычля аб арганізацыі педагагічных семінарый пры ўніверсітэтах па ўзоры існуючых у Германіі. Абмеркаваўшы пазіцыі супрацоўнікаў універсітэтаў Расіі і апякунскіх саветаў, Вучоны Камітэт у пачатку 1865 г. склаў праект «Палажэння аб падрыхтоўцы настаўнікаў для гімназій і прагімназій». Стварэннне спецыяльнай установы прызнавалася лішняй. Адзначалася, што «згодна з дваякай мэтай тэарэтычнай і практычнай адукацыі, падрыхтоўка настаўнікаў падзяляецца паміж універсітэтамі і гімназіямі. Тэарэтычная адукацыя будучых настаўнікаў складае справу ўніверсітэтаў; практычная адукацыя іх належыць гімназіям» [2, с. 68]. Нягледзячы на тое, што гэты праект быў падтрыманы і апублікаваны, новы міністр народнай асветы Д. А. Талсты ў 1867 г. дамогся яго адмены, спаслаўшыся на тое, што пры дадзенай сістэме падрыхтоўкі настаўнікі «выслізгваюць ад кантролю міністэрства» [3, с. 196]. Ён, звяртаючы ўвагу на вырашэнне рэакцыйна-ахавальных задач, аказаўся празорлівей былых кіраўнікоў міністэрства: з мэтай «укаранення класіцызму» было прынята рашэнне стварыць навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі выкладчыкаў для класічных гімназій.

З канца 60-х гг. XIX ст. сістэма педагагічнай адукацыі дапаўняецца гісторыка-філалагічнымі інстытутамі – навучальнымі ўстановамі закрытага тыпу, куды на конкурснай аснове прымаліся абітурыенты, якія скончылі класічныя гімназіі або духоўныя семінарыі па курсу філасофіі. Яны былі адкрыты ў Пецярбургу ў 1867 г. і ў Нежыне ў 1875 г. з мэтай падрыхтоўкі выкладчыкаў, у першую чаргу, старажытных моў для класічных гімназій. Інстытуты прадугледжвалі 4-гадовы тэрмін навучання: 2 гады тэарэтычнай падрыхтоўкі і 2 гады спецыяльнай практычнай вучобы.

Напрыклад, з Пецярбургскага інстытута выходзілі настаўнікі лацінскай, старажытнагрэцкай моў і рускай славеснасці (да 1884 г.), гісторыі (да 1875 г.), гісторыі і геаграфіі (з 1884 г.). Навучальныя планы былі складзены такім чынам, што студэнты, незалежна ад абранай спецыяльнасці, адначасова рыхтаваліся да выкладання грэчаскай і лацінскай моў. Гэтай жа задачы была падпарадкавана і арганізацыйная структура дадзеных навучальных устаноў: з дзесяці кафедр пяць спецыялізаваліся па класічнай філалогіі. Для паспяховага функцыянавання інстытутаў неабходны быў кампетэнтны прафесарска-выкладчыцкі састаў. Так, на руска-славянскім аддзяленні Нежынскага інстытута працавалі 2 прафесары і 1 выкладчык, на гісторыка-геаграфічным – 3 прафесары і 3 выкладчыкі, на класічным – 4 прафесары і 2 выкладчыкі [5, с. 56]. У інстытутах навучалася прыкладна па 100 чалавек (па 25 чалавек на кожным курсе) [6, л. 1–4]. Гэтыя навучальныя ўстановы мелі некалькі дзясяткаў стыпендыятаў ад розных рэгіёнаў краіны, а таксама ад Сінода. Так, з 1870 г. у Пецярбургскім інстытуце засноўваюцца спецыяльныя месцы (таксама і стыпендыі) для абітурыентаў з Віленскай навучальнай акругі [7].

Сучаснікі называлі гэтыя інстытуты не толькі двума «галоўнымі расаднікамі» настаўнікаў гуманітарных прадметаў сярэдняй школы ў Расіі, але і «апорамі талстоўскага класіцызму», абавязкова падкрэсліваючы, што «неадкладна» неабходныя змены архаічных нарматыўна-прававых актаў і вучэбнай дакументацыі, «радыкальная рэформа, здольная удыхнуць жывы дух у інстытуцкі арганізм, які памірае і ад немагчымай духоўнай ежы, і ад нездаровай маральнай атмасферы» [5, с. 56–57]. Гэтыя навучальныя ўстановы ўсё больш адрываліся ад патрэбаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, новых заходніх тэндэнцый і прыярытэтаў у адукацыі, дэманструючы кансерватызм і абсалютную нежыццёвасць старых падыходаў у пачатку XX ст.

Выкладчыкаў старажытных моў выпускалі таксама настаўніцкі інстытут славянскіх стыпендыятаў (для славян-замежнікаў, якія скончылі замежныя ўніверсітэты) і Лейпцыгская філалагічная семінарыя (1873 г.), ператвораная пазней у Рускі філалагічны інстытут (быў зачынены ў 1890 г.) Міністэрствы народнай асветы Расіі. На вучобу прымалася нязначная колькасць як «прыродных рускіх, так і ўраджэнцаў Прыбалтыйскага краю, а таксама і з заходніх славян і нават ураджэнцаў Германіі», якія мелі сярэднюю адукацыю: 15 стыпендыятаў міністэрства і 15 вольных студэнтаў. Тэрмін навучання складаў 3 гады (4 – для магістраў). Асноўнымі курсамі былі старажытныя мовы і літаратура, рымская і грэчаская гісторыя, філасофія, міфалогія і інш. [8, с. 414]. Вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы Расіі (Пецярбурга, Адэсы, Яраслаўля і інш.) і замежжа (Аахенскае, Лютыхскае і інш.) рыхтавалівыкладчыкаў спецыяльных прадметаў урэальныя вучылішчы. Іх колькасць была невялікай. Так, у 1871–1877 гг. з 135 новых выкладчыкаў, якія паступілі на службу ў сярэднія навучальныя ўстановы Віленскай навучальнай акругі, 85 чалавек былі выпускнікамі расійскіх універсітэтаў, 10 чалавек скончылі замежныя ўніверсітэты, 20 – Санкт-Пецярбургскі гісторыка-

філалагічны інстытут і толькі 11 чалавек мелі сярэднюю адукацыю. У гэты перыяд Віленская навучальная акруга пасля Санкт-Пецярбургскай і Маскоўскай займала трэцяе месца ў Расіі па колькасці настаўнікаў – выпускнікоў расійскіх універсітэтаў [9, с. 203].

Перадавая грамадскасць настойвала на стварэнні спецыяльных вышэйшых педагагічных навучальных устаноў, якія б у сваёй дзейнасці кіраваліся не палітычнымі мэтамі, а найперш рыхтавалі высокаадукаваных і метадычна падрыхтаваных педагогаў, здольных эфектыўна выконваць вучэбна-выхаваўчую работу. Станавілася відавочным, што спецыяльная педагагічная падрыхтоўка выкладчыкаў павінна была паставіць на якасна новы ўзровень навучальна-выхаваўчы працэс, заснаваны «на трывалых пачатках навукі і выпрабаваных прыёмах» [10, с. 4]. Прафесійна падрыхтаваныя педагогі мелі несумненны патэнцыял у справе сістэматычнай і творчай распрацоўцы тэорыі і практыкі навучання і выхавання, што выявілася б у з’яўленні добрых падручнікаў, рацыянальных навучальных праграм і планаў заняткаў.

Да такой высновы прыйшла спецыяльна створаная пры Педагагічным таварыстве камісія, якую ўзначальваў В. М. Міхайлоўскі. Яна займалася распрацоўкай пытання аб педагагічнай падрыхтоўцы выкладчыцкага складу. З кастрычніка 1898 г. па сакавік 1899 г. было праведзена 10 пасяджэнняў. Членамі камісіі вывучаўся гістарычны досвед педагагічнай адукацыі ў Расіі, а таксама розныя сістэмы падрыхтоўкі настаўнікаў за мяжой. У выніку было вырашана, што спецыяльна-педагагічная падрыхтоўка выкладчыкаў павінна быць цесна звязана як з універсітэтам – «з яго навукай» праз стварэнне і дзейнасць самастойнай кафедры педагогікі на гісторыка-філалагічным і фізіка-матэматычным факультэтах, так і з сярэдняй школай – вучэбнай і выхаваўчай. практыкай (знаёмства з найноўшымі прыёмамі і навыкамі класнага выкладання). У падрыхтаваным «Праекце» арганізацыя падрыхтоўкі выкладчыкаў да прафесійнай дзейнасці зводзілася да аднаго года дадатковага навучання пасля заканчэння ўніверсітэта. Спецыяльна створаная камісія з прафесарска-выкладчыцкага складу і гімназічных настаўнікаў-практыкаў надзялялася арганізацыйнымі, адміністрацыйнымі і кантрольнымі паўнамоцтвамі [10, с. 5].

Вядомыя педагогі і грамадскія дзеячы прапаноўвалі ўласныя варыянты падрыхтоўкі выкладчыцкіх кадраў: спецыяльных педагагічных інстытутаў як самастойных устаноў (аўтар К. П. Яноўскі), пяцігадовых «вучылішчаў настаўнікаў» (Д. І. Мендзялееў), спецыяльных педагагічных курсаў, семінараў і стажорства для выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў і інш. У 1902 г. была створана новая камісія па пераўтварэнні вышэйшай школы, якая павінна была распрацаваць асноўныя палажэнні аб паляпшэнні прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі выкладчыкаў для сярэдняй школы ў сістэме універсітэцкай адукацыі. У матэрыялах яе працы канстатавалася, што навукова-тэарэтычнай падрыхтоўцы спецыяліста павінна садзейнічаць педагагічная накіраванасць асноўных курсаў, якія чытаюцца ва ўніверсітэце. Быў зроблены ўпор на дапаўненне вучэбных планаў дысцыплінамі педагагічнага цыкла, эфектыўны падбор педагагічных кадраў, папаўненне матэрыяльна-тэхнічнай базы вышэйшых навучальных устаноў: абсталяванне лабараторый і кабінетаў, стварэнне музеяў, метэаралагічных станцый, выпіска навуковай і метадычнай літаратуры, наглядных дапаможнікаў і г. д. [3, с. 146–148].

Паводле архіўных звестак, большасць выкладчыкаў гімназій Беларусі ўсё ж мелі вышэйшую адукацыю [11, л. 9 ; 27, л. 2]. Працавалі ў сярэдніх навучальных установах выпускнікі духоўных акадэмій і семінарый, тэхнічных інстытутаў, Акадэміі мастацтваў, настаўніцкіх інстытутаў і г. д., а таксама тыя, хто меў званне дамашняга настаўніка. Выкладчыкамі жаночых гімназій маглі быць асобы з вышэйшай адукацыяй або якія мелі пасведчанні на званне настаўніка гімназіі або рэальнага вучылішча пасля здачы экзамена па прадмету. Пасады настаўнікаўстаражытных моўзапаўнялі часта замежныя выкладчыкі. Напрыклад, у 1873 г. прыбылі каля 100 аўстрыйскіх і нямецкіх філолагаў з універсітэцкай адукацыяй. Але які быў склад гэтых настаўнікаў, якія «амаль заўсёды вельмі павярхоўна ведалі рускую мову. Нельга думаць, каб сюды дасылалілепшых з нямецкага педагагічнага персаналу. У значнай ступені тут, верагодна, былі няўдачнікі на радзіме, шукальнікі прыгод і лёгкай нажывы» [12, с. 320].

Своеасаблівым спосабам павышэннякваліфікацыі для настаўнікаўсярэдніх навучальных установусталі курсы. Упершынюяны былі арганізаваны ў чэрвені 1906 г. пры Пецярбургскім універсітэце. Арганізатары курсаў мелі магчымасць пазнаёміцца з навукова-педагагічнымі запытамі настаўніцтва (прыбыло больш за 200 слухачоў) і на аснове гэтага падрыхтаваць праграму працы. Галоўнае месца адводзілася лекцыям па блоку гуманітарных дысцыплін, а таксама па фізіцы, матэматыцы і біялогіі. Па вечарах прав. одзіліся гутаркі «аб пастаноўцыасобных прадметаў у сярэдняй школе» і методыцы іх выкладання Акрамя гэтага былі арганізаваны экскурсіі ў Заалагічны музей, Батанічны сад, на электрычную станцыю «Геліёс», Акадэмію мастацтваў, Этнаграфічны музей і Эрмітаж. У выніку, як адзначалі слухачы, пытанне аб калектыўнай рабоце настаўніцтва ў справе самаадукацыі і павышэння маральна-духоўнага ўзроўню было «перанесена на рэальную аснову і знайшло сваё практычнае ажыццяўленне» [13, с. 9].

Роўна праз год з 5 па 25 чэрвеня 1907 г. у Пецярбургскім універсітэце была паўторана практыка правядзення падобных курсаў, арганізацыя якіх адрозніваліся ўжо больш высокім узроўнем і эфектыўнасцю. Для заняткаўі на курсах са 185 гарадоў і мястэчак Расіі з’ехалася 508 слухачоў (262 жанчыны і 246 мужчын).

Была таксама дэлегацыя і ад беларускіх губерняў, прычым у шэрагу выпадкаў выкладчыкі прыязджалі групамі: з Віцебска (11 чалавек), Вільня (9 чалавек), Мінска (8 чалавек), Гомеля (6 чалавек), а таксама прадстаўнікі з Бабруйска, Брэст-Літоўска, Дзвінска, Ліды, Мазыра, Магілёва, Полацка, Рагачова. Працавала 8 секцый: рускай мовы і літаратуры, замежных моў, гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўства, фізікі і хіміі, матэматыкі і педагогікі. Лекцыі (адведзена было больш за 120 гадзін) чыталі прафесары і выкладчыкі як пецярбургскіх, так і маскоўскіх ВНУ. Праводзіліся таксама секцыйныя практычныя заняткі, былі арганізаваны выставы навейшай навучальнай літаратуры і экскурсіі. Было відавочным, што «настаўнік, які не ўзбагачае сваіхведаў і не ўдасканальвае сваіх прыёмаў, прыносіць не толькі дыдактычную, але і педагагічную шкоду» [13, с. 4–9]. Выкладчыкіі, якія былі раскіданыя па розных кутках Расіі, якія згубіліся сярод прадстаўнікоў іншых прафесій, мелі магчымасць адчуць прыналежнасць да адзінай настаўніцкай карпарацыі. Ва ўмовах педагагічнай камунікацыі павышаўся прафесійны ўзровень слухачоў, вопыт адных станавіўся здабыткам іншых.

Такім чынам, у разглядаемы перыяд так і не склалася цэльная сістэма вышэйшай педагагічнай адукацыі. Падрыхтоўка неабходных кадраў для працы ў сярэдняй школе ажыццяўлялася рознымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Расіі і часткова замежных краін. У першую чаргу гэта былі гісторыка-філалагічныя і фізіка-матэматычныя факультэты ўніверсітэтаў Расіі, а таксама гісторыка-філалагічныя інстытуты, якія выпускалі настаўнікаў старажытных моў. Пэўная вакантная частка выкладчыцкіх месцаў (асабліва настаўнікаў, так званых, новых моў) запаўнялася тымі, хто меў сярэднюю адукацыю. Характэрнымі рысамі арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ва ўсіх навучальных установах сталі прыярытэт навукова-тэарэтычнай падрыхтоўкі (акадэмічнасць і шматпрадметнасць у навучанні) на шкоду неабходным псіхолага-педагагічным і практычным навыкам педагагічнай дзейнасці, прыніжэнне патрабаванняў педагагічнай навукі, адсюль метадычная і дыдактычная некампетэнтнасць, руціна ў працы і інш. Адсутнасць спецыяльнай педагагічнай падрыхтоўкі ў большасці выкладчыкаў сярэдняй школы з'яўлялася «адной з бачных прычын малапаспяховасці выкладання» [14, с. 83].

*Спіс літаратуры*

1. Лейкина-Свирская, В. Р. Интеллигенция России во второй половине XIX века / В. Р. Лейкина-Свирская. – М. : Мысль, 1971. – 368 с.

2. Материалы по вопросу о приготовлении учителей для гимназий и прогимназий. – СПб. : Тип. А. А. Краевского, 1865. – 90 с.

3. Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР. Вторая половина XIX в. / отв. ред. А. И. Пискунов. – М. : Педагогика, 1976. – 599 с.

4. Рождественский, С. В. Исторический обзор деятельности Министерства Народного Просвещения. 1802–1902 / С. В. Рождественский. – СПб. : Тип. А. В. Орлова, 1902. – 579 с.

5. Заблотский, П. А. Историко-филологический институт кн. Безбородко в Нежине (1875–1910) / П. А. Заблотский. – СПб., 1912. – 58 с.

6. ЦГИА СПб. – Ф. 53. Оп. 1. Д. 2219.

7. ЦГИА СПб. – Ф. 53. Оп. 1– Д. 346.

8. Исторический очерк русской школы / сост. Б. В. Григорьев. – М. – Т-во тип. А. И. Мамонтова, 1900. – 587 с.

9. Гулюк, М. А. Подготовка преподавателей для Виленского учебного округа в российских университетах во второй половине XIX в.: правительственная политика / М. А. Гулюк // Вытокі гістарычнай навукі БДУ : зб. навук. арт., прысвеч. 125-год. з дня нараджэння акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава і 70-год. гіст. ф-та БДУ / пад рэд. А. А. Яноўскага. – Мінск : БДУ, 2005. – С. 201–204.

10. К вопросу о подготовке преподавателей средних школ. – М. : тип. Г. Лисснера и А. Гемеля, 1899. – 306 с.

11. НИАБ. – Ф. 2416. Оп. 1. Д. 13.

12. Алешинцев, И. А. История гимназического образования в России (XVIII и XIX век) / И. А. Алешинцев. – СПб. : Тип. О. Богданова, 1912. – 346 с.

13. Труды курсов для учителей средней школы / под общ. ред. А. Я. Закса, С. Ф. Знаменского. – СПб. : Типо-литография Б. Я. Авидона, 1908. – 408 с.

14. Senex. К дефектам средней школы // Русская школа. – 1905. – № 2. – С. 78–87.

***Астрога Валянціна Міхайлаўна***, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

**Ostroga Valentina**
Belarusian State Technological University
e-mail: ostroha@belstu.by

APPROACHES TO SOLVING THE PROBLEM OF STAFFING
IN SECONDARY EDUCATIONAL INSTITUTIONS
OF BELARUS (SECOND HALF OF THE 19th – EARLY 20th CENTURY)

The article discusses the main approaches to solving the problem of staffing secondary school teachers in Belarus in the second half of the 19th and early 20th centuries. It is emphasized that during this period a clear system of pedagogical training was not created, it was mainly implemented by different types of higher educational institutions of Russia. The conclusions are based on the analysis of historical sources, the analysis of statistical materials and pre-revolutionary literature.

*Keywords:* secondary schools, Vilnius educational district, historical and philological institutes, universities, pedagogical courses, teachers.